# КАНТРОЛЬНЫЯ ТЭСТЫ ПА ЛЕКСІКАЛОГІІ І ФРАЗЕАЛОГІІ

## Тэст 1

**1.Адзначце, у якім выпадку даецца правільнае азначэнне слова лексіка:**

1) Лексіка — раздзел мовазнаўства, які вывучае сукупнасць слоў мовы;
2) Лексіка — гэта слоўнікі сучаснай беларускай мовы;
3) Лексіка — сукупнасць усіх слоў пэўнай мовы;
4)Лексіка — гэта ўстойлівыя спалучэнні слоў з цэласным значэннем;
5) Лексіка — гэта сукупнасць усіх моўных адзінак.

**2. Адзначце, у якім выпадку даецца правільнае азначэнне слову як адзінцы мовы:**

1) Слова — гэта частка маўлення;
2) Слова — гэта комплекс гукаў;
3) Слова — гэта гук ці комплекс гукаў, які мае пэўнае значэнне і ўжываецца ў моўных зносінах як самастойная адзінка;
4) Слова — гэта адзінка моўных зносін, пры дапамозе якой мы выказваем сваю думку;
5) Слова — гэта частка сказа.

**3. Адзначце, у якіх выпадках азначэнні ўжыты няправільна:**

1) Адназначныя словы — гэта словы з адным лексічным значэннем.
2) Мнагазначныя словы маюць некалькі лексічных значэнняў.
3) Адназначныя словы маюць толькі прамое значэнне.
4) Пераноснае значэнне — гэта асноўнае першапачатковае значэнне слова.
5) Лексічнае значэнне слова вызначаецца яго гукавым складам.

**4. Адзначце, як называюцца словы, што вымаўляюцца аднолькава, але пішуцца па-рознаму:**

1) лексічныя амонімы;
2) амографы;
3) амафоны;
4) міжмоўныя амонімы;

РЕПОЗИТОРИЙ

5) амаформы.

**5. Адзначце, у якім выпадку даецца правільнае азначэнне тэрміну амаформы:**

1) Словы адной ці розных часцін мовы, якія супадаюць у напісанні і гучанні толькі ў асобных граматычных формах.
2) Словы, якія пішуцца аднолькава, а вымаўляюцца па-рознаму.
3) Словы, у якіх супадаюць не ўсе граматычныя формы.
4) Словы, якія гучаць аднолькава ў розных мовах, але маюць рознае значэнне.
5) Словы, якія адносяцца да адной часціны мовы і супадаюць ва ўсіх граматычных формах.

**6. Адзначце, якія прыметы мае дамінанта ў сінанімічным радзе:**
1) з'яўляецца першым словам рада;
2) знаходзіцца ў канцы сінанімічнага рада;
3) з'яўляецца стылістычна нейтральным словам; 4) вырашае найбольш поўна агульнае значэнне слоў рада;
5) мае пераноснае значэнне.

**7. Словы, якія гучаць і пішуцца па-рознаму, але маюць блізкае ці аднолькавае значэнне называюцца:**
1) адназначныя;
2) амонімы;
3) мнагазначныя; 4) сінонімы;
5) паронімы.

**8. Паводле паходжання беларуская лексіка падзяляецца на:**
1) дыялектную;
2) спрадвечна беларускую;
3) кніжную; 4) запазычаную;
5) спецыяльную.

**9. Адзначце, якія словы ў беларускай мове паводле паходжання адносяцца да спрадвечна беларускіх:**
1) агульнаславянскія;
2) польскія;
3) уласнабеларускія;

Рэпазіторый

4) рускія;
5) усходнеславянскія

**10. Адзначце моўныя з’явы, неўласцівыя спрадвечна беларускім словам:**
1) спалучэнні галосных у сярэдзіне слова;
2) пераход [д] і [т] у [дз’] і [ц’] пры памякчэнні;
3) фанетычнае падаўжэнне зычных;
4) наяўнасць гука [ф];
5) пачатковыя гукі [о], [э].

**11. Адзначце, якія словы адносяцца да лексікі абмежаванага ўжывання:**
1) дыялектныя; 2)
тэрміны;
3) запазычаныя;
4) прафесіяналізмы; 5)
устарэлыя

**12. Адзначце, якія словы адносяцца да пасіўнай лексікі:**
1) агульнаўжывальныя;
2) неалагізмы;
3) устарэлыя; 4) архаізмы; 5) гістарызмы.

**13. Адзначце сказы, у якіх ёсць фразеалагізмы:** 1)
Дубок быў на сёмым небе ад радасці.
2) Паранены варухнуўся, стаў на ногі і паціху падаўся ў лес.
3) Хлапчук той нічым асаблівым не кідаўся ў вочы.
4) Стаць на ногі хвораму доктар дапамог. 5) Сабака пачуў незнаёмага, натапырыў вушы.

**14. Адзначце, якія прыметы уласцівыя фразеалагізмам як адзінкам мовы:**
1) цэласнае значэнне;
2) устойлівасць;
3) сінтаксічная непадзельнасць; 4) клічная інтанацыя;
5) шматкампанентнасць.

**15. Адзначце свабодныя словазлучэнні:**
1) вудзіць акунёў у возеры;
2) сядзець, склаўшы рукі перад сабою.

РЕПОЗИТОРИЙ

3) высока задзіраць нос перад аднакласнікамі; 4) заткнуць за пояс сякеру; 5) зрабіць на скорую руку.

**16. Адзначце словы з няправільна вызначаным лексічным значэннем:**
1) дзень — светлая частка сутак;
2) гадзіннік — прыбор для вымярэння тэмпературы;
3) столь — верхняе пакрыццё памяшкання; 4) сшытак — сшытыя лісты чыстай паперы; 5) рысора — від адзення.

**17. Адзначце адназначныя словы:**
1) грэбень;
2) спадчына;
3) салома; 4) грып; 5) брусніцы.

**18. Адзначце мнагазначныя словы:**
1) задача;
2) гарачы;
3) тальк; 4) работа; 5) паста.

**19. Адзначце, у якіх словазлучэннях выдзеленае слова ўжыта ў пераносным значэнні:**
1) людская.плынь;
2) рачная плынь; 3) літаратурная плынь; 4) марская плынь;
5) паветраная плынь.

**20. Адзначце словазлучэнні, у якіх выдзеленае слова ўжыта ў прамым значэнні:** 1) чорная нітка; 2) чорны дзень; 3) чорная фарба; 4) чорны намер; 5).чорная спадніца.

## Тэст 2

**1. Адзначце рады з лексічнымі амонімамі:**
1) крытычны артыкул — крытычны стан;
2) снежная лавіна — лавіна коннікаў;
3) водаправодны кран — пад'ёмны кран; 4) маса атама — бетонная маса;
5) дубовы клін — азімы клін.

Репозиторий

**2. Адзначце рады з амографамі:**

1) зялёная галіна — галіна навукі;
2) дрыжыць рука — дрыжыць паветра;
3) вараны конь.— вараны гарбуз; 4) прагнуць славе — прагнуць спіну;
5) вольны чалавек — вольны продаж.

**3. Адзначце рады з амафонамі:**

1) белы грыб — заразны грып;
2) салодкі гасцінец — шырокі гасцінец;
3) цікавая казка — салдацкая каска; 4) стальны бор — сасновы бор;
5) адвезці дровы — адвесці бяду.

**4. Адзначце словы, якія з’яўляюцца сінонімамі да слова смелы:**

1) адважны; 2)
магутны;
3) храбры;
4) бясстрашны;
5) вялікі.

**5. Адзначце, якое слова з’яўляецца дамінантай:**

1) шлях; 2) дарога;
3) гасцінец; 4)
гравійка;
5) аўтастрада.

**6. Адзначце рады, у якіх словы з’яўляюцца сінонімамі:**

1) песціць, лашчыць, галубіць, маўчаць;
2) мяцеліца, завіруха, замець, завея;
3) хуткі, скоры, імклівы, борзды; 4) клікаць, зваць, гукаць, спяваць; 5) доктар, урач, медык, лекар.

**7. Адзначце рады з антонімамі:**

1) горкі — салодкі; 2)
адзін — сто;
3) холадна — горача;
4) Аляксандр — Аляксандра;
5) любоў — нянавісць.

Репозиторий

**8. Адзначце словы, якія не маюць антонімаў:**

1) стол; 2)
тысяча; 3)
зіма;
4) цемра; 5)
сшытак.

**9. Адзначце паронімы, якія адрозніваюцца суфіксамі:**

1) асабісты — асабовы; 2)
бескарыслівы — бескарысны;
3) ператварыць —
перафтварыць;
4) дырэктар — дарэктар; 5)
малаважны — малавашкі.

**10. Адзначце памылковае ўжыванне паронімаў:**

1) перакладзены верш на іншую мову;
2) гэты верш перакладзены на музыку;
3) у лузе ўвесь дзень гудуць працоўныя пчолы;
4) наш народ самы працавіты ў свеце;
5) у 30-я гады пачалася драматычная творчасць К. Крапівы.

**11. Адзначце паронімы, якія адрозніваюцца прыстаўкамі:**

1) павіннасць — правіннасць; 2)
абанент — абанемент; 3)
незвычайны — надзвычайны; 4)
каранасты — караністы; 5)
уздыхнуць — удыхнуць.

**12. Адзначце запазычаныя словы:**

1) гектар; 2)
геолаг; 3)
зямля;
4) спадчына; 5)
бібліятэка.

**13. Адзначце спрадвечна беларускія словы:**

Репозиторий

1) гіпотэза; 2)
меркаванне; 3)
варыянт;
4) паўтор; 5)
корань.

**14. Адзначце словы абмежаванага ўжывання:**

1) святло;
2) лагарыфм;
3) граматыка; 4) хвартух;
5) дрыгва.

**15. Адзначце лінгвістычныя тэрміны:**

1) суфікс;
2)дзеепрыслоўе;
3) слова;
4) верш;
5) словаўтварэнне

**16. Адзначце рады слоў з прафесіяналізмамі:**

1) гэблік, адборнік, фуганак, шархебель;
2) будынак, сцяна, дзверы, падлога; 3)
майна, віра, праполіс, вулей.
4) дрэва, лес, трава, кветка.
5) вудзільна, мармышка, падсак, блясна.

**17. Адзначце словы пасіўнай лексікі:**

1) жаўнер;
2) рацъ;
3) стыль; 4) мегабус; 5) дыск.

**18. Адзначце гістарызмы:**

1) атрамант;
2) веча;
3) перст;
4) мушкет;
5) соцкі.

репозиторий

**19. Адзначце выпадкі, дзе правільна тлумачыцца значэнне фразеалагізма:**

1) адным махам — весела;

2) вешаць галаву — сумаваць;

3) у момант вока — хутка; 4) непачаты край — мала;

5) пад рукой — блізка.

**20. Адзначце рады, у якіх ёсць свабодныя словазлучэнні:**

1) язык распусціць, язык трымаць за зубамі, язык праглынуць;

2) вастрыць зубы, вастрыць зброю, вастрыць нож;

3) брацца за розум, брацца за галаву, брацца за рукі; 4) павесіць галаву, павесіць нос, павесіць паліто;

5) як піць даць, трэба даць піць.

Репозиторий